# *§ 13–0. Старажытная Русь — дзяржава ўсходніх славян

**1. Першыя пераддзяржаўныя ўтварэнні ўсходніх славян.** У сярэдзіне IX ст. ва ўсходніх славян ужо сфарміраваліся першыя пераддзяржаўныя ўтварэнні, інфармацыю пра якія даюць розныя крыніцы. Так, арабскія аўтары згадваюць нейкія *Куявію, Славію* і *Артанію (Арсанію)*. Першую можна з пэўнасцю вызначыць як вобласць вакол Кіева ў сярэднім цячэнні Дняпра. Уладар гэтай вобласці называўся высокім цюркскім тытулам «каган». «Рускі (Кіеўскі) каганат» у 30–60-я гг. IX ст. робіць значныя знешнепалітычныя захады. Захаваліся звесткі пра пасольства ў Візантыю і далей да германскага імператара, а таксама пра напады на візантыйскія ўладанні.

Даследчыкі мяркуюць, што пад Славіяй мелася на ўвазе вобласць на поўначы Русі, дзе пазней узнікне Наўгародская зямля — рэгіён, які знаходзіцца на перасячэнні важных гандлёвых шляхоў (шляху «з варагаў у грэкі» і Вялікага Волжскага шляху). Пра месцазнаходжанне Артаніі адзінства думак у навуцы няма: гэта можа быць рэгіён будучай Растоўскай зямлі, Валынь, Тмутаракань або Чарнігаўшчына.

Асноўная крыніца нашых ведаў пра першыя стагоддзі гісторыі Старажытнай Русі — «Аповесць мінулых гадоў» — звязвае першы паход русаў на Канстанцінопаль (Царград) з імёнамі скандынаваў-варагаў Аскольда і Дзіра. Скандынавы з’яўляюцца на поўначы Усходняй Еўропы нават раней за славян. Гэты рэгіён цікавіў іх перш за ўсё ў сувязі з важнымі гандлёвымі шляхамі, што праходзілі праз яго і звязвалі Паўночную Еўропу з надзвычай багатымі рынкамі Усходу. Некаторыя скандынавы аказваюцца на чале ўсходнеславянскіх міжплемянных аб’яднанняў. Летапіс паведамляе пра запрашэнне

Папрацуйце з картасхемай «Русь у IX–X стст.», змешчанай у вучэбным дапаможніку, знайдзіце месцазнаходжанне пераддзяржаўных утварэнняў славян. Растлумачце геаграфічныя і палітычныя перадумовы іх узнікнення.

славянска-фінскай канфедэрацыяй на княжанне ў Ноўгарад (якога ў той час яшчэ не існавала) варажскіх князёў Рурыка, Сіняуса і Трувора. Адбылося гэта, калі верыць летапісцу, у 862 г. Тады ж пранікаюць у Кіеў Аскольд і Дзір. Менавіта сталіца палянскага саюзу плямёнаў робіцца цэнтрам старажытнарускай дзяржавы, у склад якой увайшлі ўсе ўсходнеславянскія плямёны, а таксама некаторыя фіна-ўгорскія і балцкія народы.

**2. Старажытная Русь на палітычнай карце сярэдневяковай Еўропы.** Старажытная Русь адыграла вялікую ролю ў фарміраванні палітычнай карты сярэдневяковай Еўропы. Геаграфічнае і геапалітычнае становішча рэгіёна — на стыку еўрапейскіх і ўсходніх цывілізацый — прывяло да працяглага супрацьстаяння экспансіі качавых цюрка-мангольскіх заваёўнікаў на заходнім напрамку. Старажытная Русь, а пазней асобныя старажытнарускія княствы, стрымліваючы націск печанегаў, торкаў, полаўцаў, наўпрост або ўскосна спрыяла барацьбе балканскіх народаў супраць Візантыі і каўказскіх зямель супраць арабскага ўладарства. Русь таксама ўдзельнічала ў барацьбе славянскіх і прыбалтыйскіх (балцкіх і фіна-ўгорскіх) народаў супраць «націску на Усход» нямецкіх заваёўнікаў.

Старажытная Русь была добра вядомая ў Еўропе, і валадары асобных дзяржаў імкнуліся атрымаць яе падтрымку, усталяваць гандлёвыя, дыпламатычныя і дынастычныя сувязі. Значна палегчыла і ўмацавала знешнепалітычныя стасункі Русі з краінамі Еўропы прыняцце хрысціянства. Старажытная Русь такім чынам увайшла ў кола вялікіх хрысціянскіх дзяржаў Сярэднявечча.

На працягу дамангольскага перыяду гісторыі Старажытнай Русі адбываюцца значныя змены напрамку і зместу гандлю. Так, гандаль з Багдадскім халіфатам і дзяржавамі, што ўтварыліся пасля яго распаду, паступова слабее, назіраецца актывізацыя

эканамічных адносін з заходнееўрапейскімі дзяржавамі. Відавочным вынікам гэтых змяненняў было вялікае пашырэнне на тэрыторыі Русі германскіх, англійскіх, чэшскіх і іншых манет (дэнарыяў), якія на нейкі час прыйшлі на змену арабскім дырхемам, што панавалі раней. У сваю чаргу, тавары Русі сталі вядомыя ў еўрапейскіх краінах: у Францыі — рускае футра, у Германіі — жалезныя замкі і інш.





Вызначце, на якой ілюстрацыі паказаны аверс і рэверс арабскага дырхема, а на якой — чэшскага дэнарыя.

Палітычныя, ваенныя, дынастычныя і гандлёвыя адносіны ў Сярэднявеччы былі цесна знітаваныя. Часцяком узаемавыгадны гандаль прыводзіў да трывалага палітычнага саюзу, які замацоўваўся шлюбам паміж прадстаўнікамі кіруючых сем'яў манархаў. Гандлёвая канкурэнцыя і перашкоды гандлю патрабавалі ваеннага ўмяшання. Русь пачынала ўвязвацца ў палітычныя саюзы, на яе тэрыторыі маглі хавацца выгнаныя са сваіх дзяржаў манархі або іх сыны. Дынастыя Рурыкавічаў, што правіла на Русі, парадніласся з мноствам еўрапейскіх манархаў. Невыпадкова кіеўскага князя Яраслава Мудрага называлі цесцем Еўропы. Цесныя зносіны з еўрапейскімі дзяржавамі, дынастычныя саюзы і абмен пасольствамі патрабавалі ведання замежных моў. У сваім «Павучанні» Уладзімір Манамах адзначаў, што яго бацька Усевалад Яраславіч «дома седе, изумеяше 5 язык».

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Традыцыя ўступаць у дынастычныя шлюбы і гэтым умацоўваць адносіны паміж краінамі ўзнікла ў даўнія часы. Рускія ўладары не толькі бралі ў жонкі еўрапейскіх прынцэс, але і аддавалі сваіх дачок замуж за іншаземцаў.

1. *Сфармулюйце вызначэнне паняцця «дынастычны шлюб». Якую ролю такія шлюбы адыгрывалі ў сярэдневяковай Еўропе?*
2. *Скарыстайцеся дадатковымі крыніцамі інфармацыі і даведайцеся пра гісторыі рускіх князёўнаў, якія пабраліся шлюбам з прадстаўнікамі еўрапейскіх манархій у XI ст.*
3. *Вызначыце, якія еўрапейскія манаршыя дынастыі вядуць сваё паходжанне ад князёўны Рагнеды Полацкай.*

Старажытная Русь і яе асобныя княствы не праводзілі шырокай заваявальнай палітыкі, але каля яе межаў жыло больш за 20 падпарадкаваных народаў. Гэта былі фінскія і балцкія плямёны, паволжскія народы і народы поўначы Усходняй Еўропы. Некаторыя з іх з цягам часу цалкам страцілі незалежнасць, іншыя сталі самастойныя і прыйшлі да стварэння ўласнай дзяржаўнасці, узяўшы традыцыі арганізацыі ўлады і кіравання ва ўсходніх славян.

**3. Полацк, Ноўгарад і Кіеў у гісторыі Старажытнай Русі.** З надыходам перыяду палітычнай раздробленасці асобныя землі-княствы адзінай да таго ўсходнеславянскай дзяржавы развіваліся самастойна і кожная са сваімі асаблівасцямі. У старажытнарускіх княствах фарміраваліся свае ўстойлівыя дынастыі (Ольгавічы, Манамашычы, Расціславічы, Ізяславічы і інш.), хоць і вядомыя прыклады пераходу князёў з прастола адной зямлі-воласці на іншы. У эпоху палітычнай раздробленасці на тэрыторыі, заселенай усходнімі славянамі, магло адначасова існаваць некалькі дзяржаўных утварэнняў. Іх прынята падзяляць на два віды: феадальныя манархіі і феадальныя (баярскія) рэспублікі.

**Віды дзяржаўных утварэнняў ва ўсходніх славян**

- Феадальная манархія
- Феадальная (баярская) рэспубліка

Растлумачце, чаму абодва віды дзяржаўных утварэнняў называюцца феадальнымі.

Адным з першых на старажытнарускай этнапалітычнай прасторы атрымала незалежнасць Полацкае княства. Гэта была манархія, у якой у некаторых выпадках праяўлялі сябе рэспубліканскія інстытуты, такія як веча. Даўнія традыцыі кіравання захаваліся ў Кіеўскай зямлі, якая яшчэ доўга не траціла прывабнасці для князёў Рурыкавічаў. Адметны шлях развіцця праявіўся ў гісторыі Новагародскай зямлі — там найвышэйшымі органамі ўлады сталі рэспубліканскія інстытуты, княжацкая ўлада зрабілася выбарнай, абіраліся на вечы і вышэйшыя службовыя асобы — пасаднік і тысяцкі.

Кіеўскае княства, што было найстаражытнейшым палітычным і тэрытарыяльным ядром Старажытнай Русі, заняло асаблівае становішча. Яно не зрабілася спадчынным уладаннем ніякай княжацкай лініі і на працягу XII — першай паловы XIII ст. было агульнадынастычнай уласнасцю ўсяго княжацкага роду. У ідэале на прастоле Кіева, які заставаўся фармальна найстарэйшым горадам Русі, меў знаходзіцца найстарэйшы прадстаўнік князёў Рурыкавічаў. Насамрэч Кіеў зрабіўся аб'ектам спаборніцтва пыхлівых князёў, якія разлічвалі на сваю вайсковую моц. Каб замірыць варагуючыя дынастыі, кіеўскае баярства ўвяло сістэму саўладдзя, якая была характэрная для другой паловы XII ст. У Кіеў адначасова

запрашаліся прадстаўнікі дзвюх княжацкіх ліній, што варагавалі паміж сабой, і гэта дазваляла калі не скасаваць, дык, прынамсі, прыцішыць княжацкія ўсобіцы. Так, напрыклад, сутыкненне інтарэсаў некалькіх княжацкіх дынастый прывяло да саўладдзя ў Кіеве ў 1181–1194 гг. Святаслава Усеваладавіча (з Ольгавічаў) і Рурыка Расціславіча. Але спроба шляхам дуумвірату вырашыць праблему міжусобіц была няўдалая. Сам Рурык Расціславіч сем разоў займаў Кіеў, часам на некалькі месяцаў, і нават пастрыжэнне ў манахі (у 1203 г.) не перашкодзіла яму працягваць барацьбу.

У Новагародскай зямлі функцыі найвышэйшага органа ўлады набыло веча. З 1136 г., пасля выгнання наўгародцамі князя Усевалада Мсціславіча, князь, якога запрашалі ў Ноўгарад, заключаў з жыхарамі асаблівую дамову — «рад», умовы якога павінен быў дакладна выконваць. У выпадку парушэння «рада» князю маглі «паказаць дарогу», г. зн. выгнаць яго. Такім чынам, улада князя была абмежаваная і зводзілася ў асноўным да арганізацыі абароны Ноўгарада ад знешняй небяспекі і збору даніны.

Веча выбірала галоўных службовых асоб сваёй зямлі — пасадніка і тысяцкага, а з 1156 г. і архіепіскапа, кандыдатуру якога зацвярджаў кіеўскі мітрапаліт. У рэальнасці на вечы панавалі буйны́я баяры, чыё багацце мела двайное паходжанне. Новагародскія баяры, як правіла, былі буйны́мі зямельнымі ўласнікамі, з аднаго боку, а з другога — гандлярамі. Ноўгарад вёў шырокі гандаль з Заходняй Еўропай дзякуючы свайму выгаднаму геаграфічнаму становішчу.

Такім чынам, у гісторыі асобных зямель Старажытнай Русі перыяду раздробленасці праявіліся розныя варыянты ўнутрыпалітычнага развіцця, непасрэдна звязаныя з суадносінамі ўлады князя (манархіі) і інстытутаў народнага самакіравання (рэспубліканскіх органаў).

У чым заключалася розніца парадкаў наследавання прастола ў Старажытнай Русі і заходнееўрапейскіх дзяржавах? Падыскутуйце пра перавагі і недахопы кожнага з іх.

## СТРУКТУРА ЎЛАДЫ Ў НАЎГАРОДСКАЙ РЭСПУБЛІЦЫ




Растлумачце, чаму Новагародскую зямлю называлі вечавой баярскай рэспублікай.

Назавіце, якія формы праўлення былі ў Полацкім княстве, Новагародскім княстве і Старажытнай Русі. Прывядзіце аргументы.

**4. Эканамічнае, палітычнае і культурнае ўзаемадзеянне Старажытнарускай дзяржавы з Візантыяй.** Усходніх славян звязвалі з Візантыяй даўнія і разнапланавыя адносіны. Напачатку старажытнарускай гісторыі ўсталяваліся трывалыя гандлёвыя сувязі паміж усходнімі славянамі і візантыйцамі-рамеямі. У сталіцы Візантыі — Канстанцінопалі (Царградзе) сыходзіліся шляхі з розных напрамкаў, у тым ліку з далёкай Азіі па Вялікім шаўковым шляху. Тут жа пачынаўся шлях «з варагаў у грэкі». З трактата візантыйскага імператара Канстанціна VII Багранароднага «Аб кіраванні імперыяй» вядома, што ў першай палове X ст. кіеўскія князі збывалі ў Візантыю прадукты, якія збіралі з падуладнага насельніцтва падчас палюддзя. Пра падтрыманне гандлёвых зносін з Візантыяй сведчаць знаходкі археолагамі грэчаскіх рэчаў.

## ТАВАРААБМЕН ПАМІЖ ЗЕМЛЯМІ СТАРАЖЫТНАЙ РУСІ І ВІЗАНТЫІ

- футра
- воск
- мёд




- **амфары**
- **віно**
- **алеі**

Старажытнарускія летапісы паведамляюць пра паходы на Канстанцінопаль (Царград) і візантыйскія ўладанні кіеўскіх князёў Аскольда і Дзіра (860 г., згодна са старажытнарускімі летапісамі — у 866 г.), Алега (907 г.), Ігара (941 г., у 944 г. сабраныя войскі распусцілі). Вядома пра ўдзел у паходах кіеўскіх князёў на Царград насельніцтва беларускіх зямель — крывічоў і радзімічаў. Напружаную вайну з імперыяй

вёў князь Станіслаў Ігаравіч. Гэтыя ваенныя канфлікты заканчваліся заключэннем дамоў. Асабліва выгаднай была дамова Русі з Візантыяй 911 г. Паводле яе артыкулаў купцы атрымалі значныя прывілеі — права бязмытнага гандлю, утрыманне паслоў і купцоў за кошт імператарскай казны, дазвол зімаваць у Канстанцінопалі і наведваць візантыйскія лазні — тэрмы. Канфлікты здараліся і пазней — у часы кіеўскіх князёў Уладзіміра Святаславіча, Яраслава Мудрага і Уладзіміра Манамаха. Уладзімір Краснае Сонейка ў 988 г. (або 989 г.) захапіў візантыйскі горад Херсанес у Крыме, патрабуючы ад рамеяў выканання дамовы (выдачы замуж за кіеўскага князя візантыйскай прынцэсы Ганны). Сын Яраслава Мудрага Уладзімір здзейсніў няўдалы паход на Візантыю ў 1043 г. Канфлікт быў выкліканы забойствам на рынку Канстанцінопаля знатнага рускага купца. Апошняя вядомая паводле крыніц руска-візантыйская вайна адбылася ў 1116 г. Русь на той час ператварылася ў сур’ёзную палітычную сілу і магла ўдзельнічаць ва ўнутраным змаганні за ўладу ў суседняй імперыі.

Русь дапамагала Візантыі вайсковай сілай. Магчыма, «паход» Алега ў 907 г. на Царград заключаўся ў вайсковай дапамозе візантыйскаму імператару і шчыт, змешчаны на браме сталіцы імперыі, азначаў узяцце рамеяў пад абарону. Наёмны рускі атрад быў выпраўлены на дапамогу імператару Уладзімірам Святаславічам. Пазней у Канстанцінопалі нават стварылі пастаянны рускі корпус, які неаднаразова дапамагаў візантыйскім імператарам ва ўтаймаванні ўнутраных мяцяжоў.

Пасля прыняцця Руссю хрысціянства з Візантыі яшчэ больш умацаваліся і пашырыліся руска-візантыйскія адносіны. Ва ўсходнеславянскія гарады пастулала ўсё неабходнае для дзейнасці царквы, абрадаў і набажэнстваў. Выхадцы з Візантыі склалі вышэйшую іерархію мітраполіі Кіеўскай і ўсяе Русі. Спачатку і звычайныя святары ва ўсходнеславянскіх

землях былі грэкі або балгары. З цягам часу пачаў праяўляцца і адваротны ўплыў. Так, у першай чвэрці XI ст. быў заснаваны рускі манастыр на Афоне. У XII ст. усходнеславянскія пілігрымы не раз наведвалі хрысціянскія святыні на землях, падуладных Канстанцінопалю, і ў Палесціне. У ліку пілігрымаў была і прападобная Ефрасіння Полацкая.

Візантыя пэўным чынам паўздзейнічала на развіццё старажытнарускага права і арганізацыю дзяржаўнага кіравання. Візантыйскі зборнік законаў «Эклога» выкарыстоўваўся ў судаводстве Старажытнай Русі, візантыйскія законы былі асновай для царкоўных статутаў і рускага царкоўнага права. Існуе меркаванне, што рэфармаванне падатковай сістэмы ў Старажытнарускай дзяржаве ажыццяўлялася візантыйскімі чыноўнікамі. Візантыйскія манеты сталі ўзорамі для «златнікаў» і «срэбранікаў» Уладзіміра Краснае Сонейка, што чаканіліся на Русі.

Разнастайным было культурнае ўздзеянне Візантыі на Русь. Грэчаскія майстры заснавалі на Русі каменнае будаўніцтва. Першыя храмы захоўвалі рысы візантыйскай архітэктуры. Візантыя стала пасярэднікам у перадачы на Русь славянскай пісьмовасці, вынайдзенай грэчаскімі асветнікамі Кірылам і Мяфодзіем і іх вучнямі. З Візантыі на Русь прывозіліся першыя кнігі, узоры іканапісу. Грэчаскія майстры распісвалі старажытнарускія храмы, перапісвалі кнігі. Візантыйскія ювелірныя вырабы і іншыя прадукты рамяства служылі ўзорамі для ўсходнеславянскіх майстроў.

Такім чынам, Русь была цесна і разнастайна звязана са спадкаемніцай Рымскай імперыі Візантыяй. Пры пасярэдніцтве Візантыі ўсходнія славяне змаглі дакрануцца да скарбаў антычнай культуры.

Прывядзіце прыклады паспяховага ўзаемадзеяння і ўзаемнага ўплыву Старажытнай Русі з Візантыяй і іншымі дзяржавамі ў розных галінах.